# ПЫТАННЕ ПРАВАВОГА СТАНОВІШЧА СЯЛЯН ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ПРАЦАХ АКАДЭМІКА У. І. ПІЧЭТЫ

**_А. В. Кожар_**

_Белорусский национальный технический университет, пр. Независимости, 65, 220013, г. Минск, Беларусь, lobuzova@mail. ru_

У артыкуле разглядаюцца пытанні навуковага ўклада акадэміка У. І. Пічэты ў развіццё гісторыка-прававой навукі Беларусі, асабліва па праблеме прававога становішча сялян Вяікага Княства Літоўскага ў XVI ст., эвалюцыі структуры сельскага насельніцтва і іх павіннаснага абкладання.

**_Ключавыя словы:_** Пічэта У. І.; гісторыка-прававая навука Беларусі; прававое становішча сялян; прававое становішча халопаў.

# ВОПРОС ПРАВОВОГО ПОЛОЖЕНИЯ КРЕСТЬЯН ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО В ТРУДАХ АКАДЕМИКА В. И. ПИЧЕТЫ

**_Е. В. Кожар_**

_Белорусский национальный технический университет, пр. Независимости, 65, 220013, г. Минск, Беларусь, lobuzova@mail. ru_

В статье рассматриваются вопросы научного вклада академика В. И. Пичеты в развитие историко-правовой науки Беларуси, особенно по проблеме правового положения крестьян Веикого Княжества Литовского в XVI в., эволюции структуры сельского населения и их повинностного обложения.

**_Ключевые слова:_** Пичета В. И.; историко-правовая наука Беларуси; правовое положение крестьян; правовое положение холопов.

# THE QUESTION OF THE LEGAL STATUS OF PEASANTS OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE WORKS OF ACADEMICIAN V. I. PICHETA

**_A. V. Kozhar_**

_Belarusian National Technical University, 65 Nezavisimosti Ave., 220013, Minsk, Belarus, lobuzova@mail. ru_

The article discusses the scientific contribution of Academician V. I. Picheta to the development of the historical and legal science of Belarus, especially on the problem of the legal status of the peasants of the Grand Duchy of Lithuania in the XVI century, the evolution of the structure of the rural population and their compulsory taxation.

**_Key words:_** Picheta V. I.; historical and legal science of Belarus; legal status of peasants; legal status of serfs.

Першы рэктар БДУ акадэмік У. І. Пічэта пакінуў сваім нашчадкам велізарную спадчыну, якая налічвае каля 500 прац па гісторыі Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны.

У. І. Пічэта займаўся вывучэннем гісторыі і права Вялікага Княства Літоўскага. Асаблівую ўвагу ў сваіх працах ён надаваў перыяду XV–XVI ст. Нягледзячы на тое, што кола інтарэсаў вучонага было даволі шырокім, усё ж у першую чаргу ён вывучаў сацыяльна-эканамічнае і прававое становішча насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага, у прыватнасці халопаў і сялян.

Найважнейшая праца акадэміка У. І. Пічэты па аграрнай гісторыі Беларусі «Аграрная рэформа Сігізмунда-Аўгуста ў Літоўска-Рускай дзяржаве», якая выйшла ў свет у 1917 годзе. Яна складалася з 2-х частак, але аўтарам было прадугледжана напісанне трэцяй часткі, працу над якой, нажаль, ён не паспеў скончыць. У спадчыну нам засталіся толькі асобныя артыкулы, якія павінны былі скласці апошнюю частку даследавання. Гэта «Валочная устава каралевы Боны і устава на валокі» (1922 г.), «Наказ старостам і дзяржаўцам і валочная ўстава» (1922 г.), «Склад насельніцтва ў гаспадарскіх дварах і валасцях заходняй часткі Беларусі ў парэформенную эпоху» (1925 г.), «Гаспадарскія (велікакняжацкія двары ў заходніх валасцях Беларусі пасля рэформы Сігізмунда-Аўгуста»(1927 г.). Напэўна такія артыкулы як «Праверка правоў на зямлю ва ўладаннях каралевы Боны» (1922 г.) і «Сяляне цяглыя ў другой палове XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім» (1928 г.) таксама павінны былі стаць часткай працы аб рэформе Сігізмунда-Аўгуста, бо яны адпавядаюць тэме даследавання і гарманічна дапаўняюць папярэднія артыкулы, ствараючы адзіную карціну гістарычных падзей.

Вялікай заслугай вучонага з’яўляецца вывучэнне змен у структуры саслоўя сялян у пачатку XVI ст. і пасля рэформы Сігізмунда-Аўгуста. Асаблівую цікавасць прадстаўляюць даследаванні складу сельскага насельніцтва і яго прававога становішча ў вялікакняжацкіх уладаннях, а таксама пытанні прававога становішча халопаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI ст.

У. І. Пічэта адным з першых зрабіў дасканалы аналіз інстытута халопства ў Вялікім Княстве Літоўскім. Вучоны справядліва крытыкуе вывады сваіх папярэднікаў (В. Антановіча, І. Навіцкага, Ф. Леантовіча) аб тым, што паходжанне прыгоннага права ў Вялікім Княстве Літоўскім звязана ў першую чаргу з інстытутам халопства [2, с. 154]. Як адзначае даследчык, халопы складалі нязначную частку ад рабочай сілы двара, а асноўнай рабочай сілай былі «цяглыя людзі», якія і склалі ядро класа феадальна-залежных людзей.

Праводзячы аналіз юрыдычнай тэрміналогіі пачатку XVI ст., У. І. Пічэта робіць выснову, што ўсе тэрміны, якія ўжываліся ў судовых і прававых актах у дачыненні да халопаў («чэлядзь нявольная», «чэлядзь отчызная», «чэлядзь поспольная», «парабак», «нявольнік», «слуга», «чалядзін»), мелі адзіны сэнс і пад усімі гэтымі тэрмінамі мелася на ўвазе ўсё нявольнае насельніцтва, незалежна ад назвы, якое не мела праваздольнасці і дзеяздольнасці і з’яўлялася аб’ектам прававых зносін.

Чэлядзь была найбольш бяспраўнай часткай насельніцтва, яна не мела зямлі і іншай маёмасці, знаходзілася ў поўнай уласнасці феадала, не магла выступаць у якасці сведак у судзе. Па прававых актах чэлядзь была маёмасцю феадала і, пры здзяйсненні здзелак, гаспадар распараджаўся чэляддзю нявольнай як і іншай рухомай маёмасцю. У выпадку падзелу зямельнага ўладання чэлядзь таксама падлягала падзелу, парабка можна было прадаць або перадаць у якасці закладу – заставы. У выпадку смерці ўласніка чэлядзь у тэстаменце пералічвалася разам з іншай рухомай маёмасцю.

Чэлядзь магла атрымаць волю па акту, які выдаваў гаспадар. Таксама гаспадар мог у сваім тэстаменце ўказаць, што пасля яго смерці чэлядзін атрымае волю.

Стан чэлядзі нявольнай перадаваўся па спадчыне. Але калі бацькі не знаходзіліся ў шлюбе і адзін з іх быў вольны, іх дзеці маглі былі быць прызнаны па суду вольнымі.

Варта адзначыць, што ў XVI ст. прававое становішча чэлядзі часткова змянілася. Феадалам было не выгадна ўтрымліваць парабкаў і выплачваць ім «месячыну», таму паступова чэлядзь пачалі асаджваць на зямлю, такім чынам яны пачалі зліваціца з залежнымі сялянамі («отчычамі», «людзьмі непахожымі»). Гэтыя парабкі ўжо не жылі ў самой сядзібе феадала, мелі свае «прырабкі і бонды» і жылі не толькі на «месячыну», але і з вытворчасці уласнай гаспадаркі.

Нельга цалкам згадзіцца з поглядам У. І. Пічэты, што чэлядзь не мела праваздольнасці і дзеяздольнасці [2, с. 172], бо ўжо арт. 19 Судзебніка Казіміра 1468 года ўтрымліваў палажэнне, што парабкі, якія здзейснілі крадзеж, нясуць адказнасць сваёй маёмасцю [1, с. 129]. Падобнае палажэнне замацоўваў і арт. 7 раздзела XII Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 года [4, с. 208]. Такім чынам за чэляддзю ўжо замацоўваліся некаторыя, хаця і вельмі абмежаваныя, элементы правасуб’ектнасці.

Як піша У. І. Пічэта, пры правядзенні зямельнай рэформы Боны Сфорцы і Сігізмунда-Аўгуста прававое становішча халопаў у дзяржаўных маёнтках змянілася, бо ўсе яны былі асаджаны на зямлю, пераведзены ў разрад агароднікаў і фактычна зліліся з прыгоннымі сялянамі. З свайго надзела яна выконвалі «нявольніцкую службу», сутнасць якой не была канкрэтызавана ў пісцовых кнігах, і выконвалі паншчыну.

Такім чынам, аўтар робіць выснову, што з прыняццем Уставы на валокі чэлядзь нявольная ў дзяржаўных маёнтках цалкам знікла як асобная група насельніцтва [2, с. 49]. Але ў сваіх больш позніх працах У. І. Пічэта ўказвае, што стан нявольнікаў знік у 1560-1566 гады [2, с. 168], ці да моманту выдання Статута 1588 года [2, с. 388]. Як паказваюць пазнейшыя даследаванні, чэлядзь нявольная існавала і пазней гэтага часу ў прыватнаўласніцкіх маёнтках.

Агароднікі, да якіх стала адносіцца чэлядзь, асаджаная на зямлю, былі адной з найбольш бедных груп сялянскага насельніцтва. Ім даваўся зямельны надзел, які адрозніваўся ў розных маёнтках і складаў ад 3 да 12 моргаў. Згодна з Уставай на валокі на 3 моргі зямлі агароднікі павінны былі выконваць паншчыну адзін раз на тыдзень, а жонкі працаваць 6 дзён у год у час жніва і праполкі агарода. Калі агароднікі валодалі большай колькасцю моргаў, то рэвізоры маглі іх абкласці чыншам па 3 гроша з кожнага морга.

Звяртаючы ўвагу на валасных сялян, У. І. Пічэта падзяляе іх на тры групы: сялян-рамеснікаў, якія неслі пэўныя службы, цяглых і асаднікаў.

Як адзначае У. І. Пічэта, вышэйшым разрадам сельскага насельніцтва былі баяры, якія на розных умовах валодалі зямлёй. Яны павінны былі несці вайсковую службу, як і мясцовыя шляхціцы. Баяры не плацілі чынш і не выконвалі павіннасцей, якія несла цяглае насельніцтва.

Да вышэйшага разрада сялян вучоны таксама адносіць служак, якія ездзілі з каралеўскімі лістамі, баяр путных і стральцоў. Баяры путныя і стральцы ў мірны час павінны былі выплачваць толькі пэўную колькасць грошай і вызваляліся ад іншых павіннасцей. А ў ваенны час баяры путныя павінны былі выставіць па аднаму каню з двух валок і вызваляліся ад выплаты грошаў.

Сяляне, якія неслі розныя службы (конюхі, бортнікі, асочнікі і г. д.), Уставай на валокі вызваляліся ад агульных павіннасцей; іх прававое становішча рэгулявалася спецыяльнымі нормамі. Так, бортнікі, акрамя сваёй службы, плацілі грошы, як і асадныя сяляне, але толькі ў мірны час. У час вайны яны вызваляліся ад падаткаў.

Асаднікі, якія складалі найбольш шматлікую групу сярод гаспадарскіх сялян, не неслі ніякіх натуральных павіннасцей. Яны былі павінны выплачваць пэўныя грошы ў дзяржаўны скарб. Выплаты складаліся з чынша, выплат за курэй, яйкі, гусей, невада, стацыі, за авёс і сена, за талаку і гвалты і інш. Зрабіўшы аналіз Кобрынскай і Гродзенскай эканомій, Пінскага і Берасцейскага староств, Жмудзі і іншых зямель, У. І. Пічэта прыйшоў да высновы, што асадныя сяляне абкладаліся выплатамі, прадугледжанымі Уставай на валокі для кожнай катэгорыі зямель. Рэвізоры праводзілі ўраўняльную палітыку адносна гаспадарскіх сялян і паступлення грошаў у гаспадарскі скарб, але ў выпадках, калі якасць зямлі ці неабходнасць распрацоўкі новай зямлі не дазвалялі сялянам выплачваць неабходную суму грошай, рэвізоры ішлі на адступленні ад Уставы на валокі і рабілі пэўныя ільготы.

Прааналізаваў некаторыя інвентары прыватнаўласніцкіх маёнткаў, аўтар прыходзіць да высновы, што палажэнне прыватнаўласніцкіх сялян-асаднікаў было значна больш цяжкім, чым дзяржаўных [2, с. 92].

Значная ўвага ў працах У. І. Пічэты надаецца цяглым сялянам. Згодна з Уставай на валокі для гаспадарскіх двароў на кожную валоку дваровай раллі павінна было быць сем цяглых валок. Гэтае патрабаванне ў большасці сваёй выконвалася, за выключэннем тых раёнаў, дзе была вельмі дрэнная якасць глебы.

Павіннасці цяглях сялян складаліся з паншчыны, чынша, грошаў за авёс і сена, за гусей і курэй, стацыі і невада. Паншчыну гаспадарскія сяляне павінны былі адпрацоўваць па 2 дні ў тыдзень, а таксама 4 дні ў год летняй талакі, акрамя трох тыдняў у год, вольных ад паншчыны. Як заўважае У. І. Пічэта, ў канцы XVI ст. адбываецца рост павіннасцей цяглага насельніцтва, што значна пагаршала яго становішча. Так ў некаторых маёнтках сяляне выконвалі 3 дні паншчыны ў тыдзень [2, с. 123], а ў іншых нават 4 [2,с. 99].

Асаблівую групу сялян складалі вольныя людзі. Яны выконвалі пэўныя павіннасці ці выплачвалі падаткі, але ў адрозненне ад прыгонных сялян мелі права перайсці ад аднаго землеўладальніка да іншага. Гэтыя сяляне называліся «людзі пахожыя», «людзі прыхожыя» або «слабодзічы».

Вольныя людзі выконвалі павіннасці па дамоўленасці з землеўласнікам ў залежнасці ад зямлі, якая была ў іх дзяржанні. Яны маглі выконваць цяглую службы, але гэта не абазначала, што яны адносіліся да прыгонных сялян. Пры пераходзе зямлі да іншага феадала павіннасці вольных людзей не павінны былі змяняцца. Калі вольнаму чалавеку не

падабалася служба, ён мог пры выкананні пэўных умоў перайсці да іншага феадала. Зразумела, што феадалы былі зацікаўлены, каб людзі пахожыя ад іх не сыходзілі, таму заканадаўства ішло па шляху запрыгоньвання сялян. Для таго каб сысці ад феадала, было неабходна папярэдзіць яго, сысці можна было толькі пасля збору ўраджаю, калі вольны чалавек засяляўся ў дом, ён павінен быў пакінуць яго ў тым жа стане ў якім браў.

Такім чынам, падводзячы вынік, можна сказаць, што У. І. Пічэта зрабіў велізарны ўклад ў даследаванне сацыяльна-эканамічнага і прававога палажэнне сялян. Але ён праводзіў аналіз у асноўным у велікакняжацкіх маёнткаў заходняй часткі Беларусі і Літвы, таму яго даследаванне не з'яўляецца вычарпальным. Пры гэтым і на сённяшні час яго працы застаюцца актуальнымі і, нягледзячы на пашырэнне даследаванняў ў пытаннях сацыяльна-эканамічнага і прававога становішча сялян, выклікаюць зацікаўленасць сучасных вучоных і з'яўляюцца базай для вывучэння гісторыкамі і прававедамі.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Белоруссия в эпоху феодализма / Академия наук БССР, Институт истории, Архивное управление МВД БССР. Т. 1 : С древнейших времен до середины XVII века. Мінск, 1959. 515 с.

2. Пичета В. И. Белоруссия и Литва XV–XVI вв.: (исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития). М.: Издательство Академии наук СССР, 1961. 814 с.

3. Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией. Т. 30. СПб: Тип. К. Маттисена, 1914. 538 с.

4. Статут Великого княжества Литовского 1529 года / Академия наук Белорусской ССР, Отдел правовых наук. Минск : Издательство Академии наук БССР, 1960. 253 с.